# ПРАБЛЕМЫ ПРАВАВОГА РЭГУЛЯВАННЯ ДАСУДОВАГА ПАГАДНЕННЯ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

**Ю. В. Лугоўская**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*lugovskaya_1@mail.ru;*
*навук. кір. – В. І. Самарын, канд. юрыд. навук, дац.*

У артыкуле аналізуецца нарматыўнае замацаванне дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве ў крымінальным працэсе Рэспублікі Беларусь. Абгрунтоўваецца неабходнасць змянення і дапаўнення сучасных падыходаў да рэгулявання дасудовага пагаднення аб супрацоўніцтве на падставе зробленага аналізу. Прапаноўваецца замацаваць магчымасць заключаць дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве следчаму са згоды пракурора або непасрэдна пракурору, калі ён сам вядзе крымінальную справу, а таксама забяспечыць магчымасць пацярпеламу даведацца пра заключэнне пагаднення і выказаць сваю думку наконт магчымасці або немагчымасці яго заключэння.

***Ключавыя словы***: дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве, здзелка з правасуддзем, кампрамісныя працэдуры.

Дасудовае пагадненне аб супрацоўніцтве (далей – ДПС) – інстытут адносна новы, быў уведзены ў прававую сістэму нашай дзяржавы ў 2015 годзе.

ДПС – гэта пагадненне, якое заключаецца ў пісьмовым выглядзе паміж падазраваным (абвінавачваным) (далей – п. (а.)) і пракурорам, у якім вызначаюцца абавязацельствы п. (а.) па аказанні садзейнічання папярэдняму следству і ўмовы наступлення адказнасці п. (а.) пры выкананні ім вызначаных абавязацельстваў (п. $4^1$ ч . 1 арт. 6 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – КПК)) [1].

У артыкуле $468^6$ КПК змяшчаецца пералік выключэнняў, калі ДПС не заключаецца:

· з асобамі, якія здзейснілі грамадска небяспечны ўчынак ў стане несвядомасці;

· па справах, узбуджаных у парадку паскоранага вядзення;

· калі садзейнічанне п. (а.) заключаецца ў паведамленні звестак выключна аб сваім удзеле ў злачыннай дзейнасці [1].

Апошняе выключэнне ў адпаведнасці з законапраектам, ухваленым Саветам Рэспублікі, плануецца зняць [2].

Па-першае, не зусім зразумела, хто можа на падставе гэтых выключэнняў адмовіць у заключэнні ДПС: выключна пракурор або таксама і следчы. Здаецца, што калі пракурор вырашае амаль што ўсе

пытанні ў дачыненні да заключэння ДПС, то яму цалкам і належыць права адмовіць ў заключэнні ДПС.

Па-другое, калі адзін з бакоў пагаднення не разумее, што робіць у момант, калі заключае пагадненне (нават калі разумеў у момант здзяйснення злачынства), то гэта таксама павінна быць падставай для незаключэння пагаднення або яго скасавання, калі яно ўжо было заключана. Мэтазгодна замацаваць акрамя несвядомасці яшчэ і выпадкі, калі асоба пасля здзяйснення злачынства набыла псіхічнае расстройства (захворванне), з прычыны якога не можа разумець значэння сваіх дзеянняў або кіраваць імі.

Па-трэцяе, ДПС можна заключыць наконт усіх катэгорый злачынстваў. Улічваючы мэту ўвядзення дадзенага інстытуту, прапануем абмежаваць магчымасць заключэння ДПС толькі катэгорыямі цяжкага і асабліва цяжкага злачынства.

Для таго, каб заключыць ДПС, трэба першапачаткова накіраваць хадайніцтва пракурору праз следчага.

Змест хадайніцтва рэгламентуецца ч. 4 арт. $468^6$ КПК.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што ў хадайніцтве (і потым непасрэдна ў ДПС) п. (а.) прызнае сваю віну ў здзяйсненні злачынства.

У даследаваннях акцэнтуецца ўвага на тое, што віна па сутнасці не з'яўляецца істотнай умовай ДПС. Гэта абумоўлена тым, што далейшая адмова п. (а.) ад прызнання віны ў здзяйсненні злачынства не прызнаецца падставай для прызнання пагаднення няправадзельным, не ўплывае на рашэнне пракурора аб пацвярджэнні ўзятых на сябе п. (а.) абавязацельстваў і накіраванні крымінальнай справы ў суд, а таксама не з'яўляецца вызначальным па пытанні аб магчымасці прымянення больш мяккага пакарання [3].

Таксама даследчыкамі абгрунтоўваецца неабходнасць выключэння гэтага патрабавання зыходзячы з наступнага:

- паміж бакамі можа ўзнікнуць спрэчка наконт належнасці кваліфікацыі злачынства;
- наконт падазраванага не сфармулявана абвінавачванне і адпаведна не акрэслена кола ўчынкаў, у здзяйсненні якіх асоба можа прызнаць сябе вінаватай[4].

Трэба дадаць яшчэ і тое, што абвінавачванне не павінна грунтавацца выключна на паказаннях п. (а.) і прызнанні ім сваёй віны ў здзяйсненні злачынства.

Прапануецца выключыць гэтае патрабаванне як у хадайніцтве, так і непасрэдна ў ДПС.

Следчы на працягу трох сутак накіроўвае пракурору хадайніцтва разам з даведкай аб магчымасці або немагчымасці заключэння з п. (а.) ДПС [1].

Як можна заўважыць, роля следчага заключаецца выключна ў пасрэдніцтве, яго даведка мае рэкамендацыйны характар, але далей працаваць з крымінальнай справай і непасрэдна з п. (а.) будзе сам следчы. З улікам гэтага мэтазгодна замацаваць магчымасць заключаць ДПС следчаму са згоды пракурора або непасрэдна  пракурору, калі ён сам вядзе крымінальную справу.

Асобныя пытанні выклікае роля пацярпелага ў заключэнні ДПС. У дадзены момант пацярпелы нават не будзе ведаць аб тым, што заключана ДПС згодна з ч. 1 арт. 72 КПК. Пажадана замацаваць у КПК норму, якая забяспечыць магчымасць пацярпеламу даведацца пра заключэнне ДПС і выказаць сваю думку наконт магчымасці або немагчымасці заключэння з п. (а.) ДПС, якая будзе мець рэкамендацыйны характар.

Пракурор або яго намеснік на працягу трох дзён разглядае хадайніцтва і даведку следчага, у выніку чаго выносіць адно з наступных рашэнняў:

· аб задаволенні хадайніцтва;

· аб адмове ў задаволенні хадайніцтва [1].

Варыянта з тым, каб спытаць штосьці ў п. (а.) або ўдасканаліць штонебудзь у хадайніцтве не прадугледжана законам. Гэта значыць, што на практыцы трэба прымаць рашэнне аб адмове ў задаволенні хадайніцтва. П. (а.) выпраўляе хадайніцтва (калі ведае, што трэба выправіць) і зноў здзяйсняецца амаль што тыднёвая працэдура. Абскардзіць рашэнне пракурора нельга. Таму зразумелым падаецца дазволіць абскарджанне рашэння пракурора і магчымасць удасканалення і выпраўлення хадайніцтва.

Калі прымаецца рашэнне аб адмове ў задаволенні хадайніцтва ніякія дакументы не далучаюцца да крымінальнай справы, таму суд не мае інфармацыі, што асоба жадала садзейнічаць папярэдняму следству. Наконт гэтага акцэнтуецца ўвага ў даследаваннях [5]. Прапанова відавочная: далучаць да крымінальнай справы пэўную даведку аб выказанай п. (а.) прапанове, прынятых рашэннях і матывах апошніх..

У КПК няма пераліку ўмоў для адмовы ў задаволенні хадайніцтва. У тэорыі робіцца спроба вылучыць наступныя ўмовы:

· несвядомасць;

· неўдзел абаронцы (у сувязі з тым, што яго ўдзел з’яўляецца абавязковым згодна з п. 7 ч. 1 арт. 45 КПК);

· прадастаўленне звестак выключна аб сваім удзеле ў злачынстве, загадзя ілжывых або ўжо вядомых папярэдняму следству;

· справа, узбуджаная ў парадку паскоранага вядзення [4].

Змест ДПС рэгламентуэцца ч. 2 арт. $468^8$ КПК. Пры яе аналізе мы таксама выявілі пэўныя спрэчныя моманты.

Па-першае, дадзеных аб асобе недастаткова, каб вызначыць бок у пагадненні. Таму трэба ўказваць таксама месца жыхарства, сямейны стан, месца працы асобы, узровень адукацыі і іншыя звесткі, уключэнне якіх следчы лічыць неабходным, для таго, каб скласці больш дакладнае ўяўленне аб гэтай асобе.

Па-другое, ёсць частковая неадпаведнасць азначэння ДПС (арт. 6 КПК) і таго, што замацавана ў КПК наконт зместу пагаднення (арт. $468^8$ КПК):

· у азначэнні ідзе гаворка пра крымінальную адказнасць увогуле, а змест пагаднення прадугледжвае толькі пакаранне;

· у азначэнні ідзе гаворка пра ўмовы адказнасці пры выкананні абавязацельстваў, прадугледжаных ДПС, а арт. $468^8$ КПК прадугледжвае, што нават калі ты выканаеш усё, што прадугледжвае ДПС, суд можа не ўлічваць як факт заключэння ДПС, так і дапамогу папярэдняму следству ўвогуле.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ДПС – гэта адносна новы інстытут у крымінальным працэсе, праблемы яго прававога рэгулявання ўжо існуюць. У прыватнасці, трэба перагледзець падыходы заканадаўцы да разумення, што ёсць ДПС, а таксама момантаў, звязаных з роляй следчага і пацярпелага ў дачыненні да ДПС, зместу як хадайніцтва аб заключэнні ДПС, так і непасрэдна пагаднення, да выключэнняў, на падставе якіх можна адмовіць у заключэнні ДПС і г.д.

**Библиографические ссылки:**


1 Уголовно-процессуальный кодекс Республики Беларусь [Электронный ресурс] : 16 июля 1999 г. № 295-З : принят Палатой представителей 24 июня 1999 года : одобрен Советом Респ. 30 июня 1999 года : с изм. и доп. от 6 января 2021 г. № 85-З // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2021.

2 Проект Закона Республики Беларусь «Об изменении кодексов по вопросам уголовной ответственности» [Электронный ресурс] / Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=3941&p0=2021017015. – Дата доступа: 16.05.2021.

3 *Климович, Ю. С.* Перспективы института досудебного соглашения о сотрудничестве в отечественном законодательстве // Юстыцыя Беларусі. 2013. № 10. С. 29-31.

4 *Самарин, В. И.* Теоретико-прикладной аспект проблематики введения досудебного соглашения о сотрудничестве в уголовно-процессуальное

законодательство Республики Беларусь // Університетські наукові записки. 2014. № 2. С. 321-327.
5 Досудебное соглашение о сотрудничестве: плюсы и минусы в контексте правоприменительной практики [Электронный ресурс] / Белорусская республиканская коллегия адвокатов. – Режим доступа: https://rka.by/blogs/dosudebnoe-soglashenie-o-sotrudnichestve-0. – Дата доступа: 16.05.2021.